УДК 343.1

***А.М. Сяргейчык***

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ДОКАЗАЎ І ІХ КРЫНІЦ: ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

Значная ўвага на ўсіх стадыях крымінальнага працэсу надаецца ацэнцы доказаў і іх крыніц суб'ектамі даказвання.

Ацэнка доказаў і іх крыніц з'яўляецца разумовай, лагічнай дзейнасцю. Гэта дзейнасць мае істотнае значэнне для службовых асоб органаў, якія вядуць крымінальны працэс, пры збіранні і праверцы доказаў. Як асобны, самастойны элемент працэсу даказвання ацэнка мае месца тады, калі неабходна прыняць (а ў выпадках, прадугледжаных законам, і пісьмова замацаваць) працэсуальнае рашэнне – прамежкавае або выніковае – для пэўнай стадыі, а таксама для асобы і таму для ўсяго вядзення па справе. Ацэнка доказаў і іх крыніц, такім чынам, з'яўляецца неабходнай перадумовай прыняцця і абгрунтавання амаль любога рашэння па справе.

Аб'ектам ацэнкі з'яўляюцца як доказы (фактычныя даныя, звесткі), так і працэсуальныя крыніцы, якія іх утрымліваюць (паказанні сведак, пацярпелых, заключэнне эксперта і да т. п.). У літаратуры по крымінальнаму працэсу, як правіла, вядзецца гаворка толькі пра ацэнку доказаў, таму што часта мае месца атаясамліванне паняццяў доказаў і іх працэсуальных крыніц. Такі падыход, як падаецца, з'яўляецца не зусім паслядоўным, паколькі ацэнцы фактычна падлягаюць і не толькі доказы, але і іх працэсуальныя крыніцы.

У вучэнні аб ацэнцы доказаў юрыдычныя праблемы пераплятаюцца з праблемамі светапогляду, тэорыі пазнання, псіхалогіі, логікі і іншых навук. Большасць працэсуалістаў разглядаюць ацэнку доказаў як асаблівую разумовую дзейнасць суб'ектаў даказвання ў крымінальным працэсе. Аднак існуе і іншы погляд на гэту праблему. Некаторыя вучоныя лічаць, што ацэнка доказаў і іх працэсуальных крыніц прадугледжвае акрамя ўласна разумовай дзейнасці яшчэ і працэсуальныя дзеянні, паколькі калі б ацэнка зводзілася толькі да разумовых аперацый, яна не выходзіла б за межы свядомасці адпаведнага суб'екта даказвання, была б нікому невядомая і такім чынам пазбаўленая якога-небудзь юрыдычнага значэння.

Крытэрыем ацэнкі працэсуальных крыніц доказаў з'яўляецца вызначэнне дапушчальнасці іх выкарыстання ў справе і паўнаты звестак, якія ў іх утрымліваюцца. Уяўляецца, што ў працэсе ацэньвання працэсуальнай крыніцы з пункту гледжання яе дапушчальнасці павінны быць высветлены наступныя пытанні:

ці прадугледжана дадзеная працэсуальная крыніца гл. 10 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (КПК);

ці не было дапушчана парушэнне крымінальна-працэсуальнага закону ў працэсе фарміравання гэтай працэсуальнай крыніцы;

калі былі парушэнні закону пры атрыманні працэсуальнай крыніцы, то наколькі яны паўплывалі на дакладнасць наяўных у крыніцы звестак;

ці магчымае наогул выкарыстанне дадзенай крыніцы і звестак, якія змяшчаюцца ў ёй, у працэсе даказвання пры ўстанаўленні пэўных парушэнняў працэсуальнага закону ў ходзе іх атрымання?

Ацэнка паўнаты працэсуальнай крыніцы доказаў адбываецца шляхам высвятлення таго, наколькі ўсебакова і поўна наяўная ў крыніцы інфармацыя дазваляе ўстанавіць тую ці іншую акалічнасць, якая ўваходзіць у прадмет даказвання. Такая ацэнка можа таксама ажыццяўляцца ў дачыненні да крыніцы, атрыманай пры правядзенні некалькіх следчых дзеянняў з суб'ектам паказанняў (допыт, вочная стаўка, узнаўленне абстаноўкі і акалічнасцей падзеі і інш.). Апрача таго, змест адной працэсуальнай крыніцы можа параўноўвацца са зместам іншай.

На думку С. Стахоўскага, суб'ектамі ацэнкі доказаў і іх крыніц з'яўляюцца акрамя судова-следчых органаў таксама падазроныя, абвінавачаныя, іх законныя прадстаўнікі, абаронцы, пацярпелыя, грамадзянскія ісцы, грамадзянскія адказчыкі, іх прадстаўнікі, якія не маюць права праводзіць якія-небудзь следчыя або судовыя дзеянні па праверцы доказаў. Але там, дзе праверка і ацэнка фактычных даных з'яўляюцца толькі разумовай дзейнасцю, яны могуць праверыць і ацаніць доказы, якія ёсць у справе, і іх працэсуальныя крыніцы.

Крытэрыямі ацэнкі доказаў з'яўляюцца дакладнасць, адноснасць, дапушчальнасць, а ў іх сукупнасці – дастатковасць доказаў (ч. 1 арт. 105 КПК).

Дакладнасць доказаў азначае, што яны аб'ектыўна і адэкватна адлюстроўваюць матэрыяльныя і нематэрыяльныя сляды.

Адноснасць доказаў вызначаецца іх прыдатнасцю для ўстанаўлення наяўнасці або адсутнасці акалічнасцей, якія ўваходзяць у прадмет даказвання, а таксама якія па дадзенай справе з'яўляюцца дапаможнымі або звязанымі з прадметам даказвання. Адноснасць прамых доказаў заўсёды відавочная. Цяжкасці выклікае пытанне пра адноснасць ускосных доказаў, абумоўленае тым, што кожнаму такому доказу, узятаму асобна, можа быць дадзены некалькі розных тлумачэнняў. Таму вырашэнне пытання пра адноснасць ускоснага доказу спачатку выступае ў форме меркавання-здагадкі пра яго прыналежнасць да акалічнасцей, якія падлягаюць устанаўленню, і толькі ў працэсе далейшага расследавання справы можна прыйсці да канчатковай высновы пра адноснасць або неадноснасць канкрэтнага ўскоснага доказу.

Вырашэнне пытання пра адноснасць доказаў, як падаецца, прадугледжвае даследаванне двух узаемазвязаных момантаў: факт, для ўстанаўлення якога выкарыстоўваецца дадзены доказ, уваходзіць у прадмет даказвання або з'яўляецца прамежкавым і дапаможным, г. зн. неабходным для праверкі версій і доказаў; з улікам зместу доказу магчыма ці немагчыма гэты факт устанавіць.

Дапушчальнасць доказаў вызначаецца законнасцю крыніцы, умоў і спосабаў іх атрымання.

Адной з асноўных гарантый абароны правоў чалавека ў крымінальным працэсе ад неправамерных дзеянняў органаў крымінальнага праследавання з'яўляецца прызнанне доказаў, атрыманых з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых кры-

мінальна-працэсуальнымі нормамі, недапушчальнымі, г. зн. такімі, што не маюць доказнага значэння. Разам з тым паняцце дапушчальнасці доказаў, як уяўляецца, змяшчае ў сабе супярэчнасць, паколькі з пункту гледжання законаў логікі не можа быць недапушчальным доказ, які ўжо ёсць.

Згодна з ч. 7 арт. 105 КПК сукупнасць доказаў можа быць прызнана дастатковай, калі яна дазваляе вызначыць акалічнасці, якія падлягаюць даказванню па крымінальнай справе.

Такім чынам, крытэрыямі такога важнага і існуючага на ўсіх стадыях крымінальнага працэсу элемента даказвання, як ацэнка доказаў і іх крыніц, з'яўляюцца: дапушчальнасць выкарыстання ў справе крыніц і доказаў і паўната звестак, якія ў іх утрымліваюцца; дакладнасць, адноснасць і дапушчальнасць доказаў, а пры іх сукупнасці – дастатковаць.

Гэтыя крытэрыі як паасобна, так і ў сукупнасці маюць вялікае значэнне пры ацэнцы доказаў і іх крыніц па крымінальнай справе. Наяўнасць усіх вызначаных прымет дае магчымасць лічыць пэўныя факты, падзеі, з'явы доказамі па справе. І наадварот, адсутнасць хаця б адной з іх з'яўляецца падставай для непрызнання такога доказу належным.

УДК 343.98

***Е.А. Тимофеева***

## ТИПИЧНЫЕ ВЕРСИИ ПО ДЕЛАМ О ХИЩЕНИЯХ, СОВЕРШАЕМЫХ ДОЛЖНОСТНЫМИ ЛИЦАМИ В ОРГАНИЗАЦИЯХ СОБСТВЕННИКОВ

Как показывает сложившаяся следственно-судебная практика, при поступлении информации о совершенном хищении должностным лицом в организации, осуществляющей управление общим имуществом жилых домов (в организации собственников), имеет место неопределенность, неясность ситуации, которая возникает из-за отсутствия качественных и достоверных данных. Это обстоятельство приводит к выдвижению оперативным сотрудником или следователем множества возможных версий, которые необходимо проверять, что является неэффективным и трудозатратным мероприятием. Именно знание наиболее часто встречаемых типичных версий по делам о хищениях, совершенных должностными лицами в организациях собственников, поможет правильно оценить имеющуюся информацию и сориентироваться относительно дальнейших действий оперативному сотруднику, следователю при раскрытии преступления, расследовании уголовного дела. В дальнейшем типичные версии, являясь результатом обобщения практики, помогут выдвинуть реальные версии по конкретному уголовному делу.

Как и по другим преступлениям, типичные версии по уголовным делам о хищениях, совершаемых должностными лицами в организациях собственников, делятся на общие и частные. Общие типичные версии представляют собой логическое предположение о том, действительно ли имело место рассматриваемое преступление. Относительно рассматриваемого вида преступления такими версиями являются:

имело место хищение путем злоупотребления служебными полномочиями;

в действиях должностных лиц организации собственников содержатся признаки мошенничества, присвоения либо растраты;

признаки хищения в действиях должностного лица отсутствуют, имело место иное преступление;

в действиях должностного лица отсутствуют признаки какого-либо преступления, а имеет место нарушения административного, гражданского, налогового законодательства, правил ведения бухгалтерского учета и пр.;

действия должностного лица соответствуют требованиям закона.

Частные типичные версии по делам о хищениях, совершенных должностными лицами в организациях собственников, выдвигаются с учетом невыясненных обстоятельств относительно виновных лиц, способов совершения хищения, целях, мотивах и пр.

Частные типичные версии по делам о хищениях, совершаемых должностными лицами в организациях собственников, можно выделить с учетом следующих оснований для классификации.

По способам преступной деятельности выделяют следующие частные типичные версии:

хищение совершалось путем составления подложных документов или таковые не составлялись;

хищение совершалось с помощью использования программного комплекса «Клиент-Банк» или напрямую через подачу документов в обслуживающий банк;

хищение совершалось путем перечисления денежных средств на счета аффилированных лиц или происходило завладение денежными средствами напрямую должностными лицами организации собственников.

По эпизодам преступной деятельности рассматривают следующие частные типичные версии:

хищение совершалось единожды;

преступная деятельность носит многоэпизодный характер.

По субъектам преступной деятельности и лицам, к ней причастным, выделяют следующие частные типичные версии:

хищение совершено самостоятельно председателем организации собственников;

имел место преступный сговор председателя и бухгалтера организации собственников (или преступный сговор с иным должностным лицом);

хищение совершено не должностным, а иным лицом, не имеющим данного статуса.

По объектам-носителям следовой информации выдвигают следующие частные типичные версии:

при хищении должностные лица создавали подложные документы или происходило искажение сведений в имеющихся документах организации;